ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
28.08.2025 №155

# Вучэбная праграма
# па вучэбным прадмеце «Выяўленчае мастацтва»
# для I–V класаў першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Выяўленчае мастацтва» (далей – вучэбная праграма) распрацавана для I–V класаў першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю.

2. На вывучэнне вучэбнага прадмета «Выяўленчае мастацтва» у I–III класах адводзіцца 34 гадзіны на год (1 гадзіна на тыдзень), у IV–V класах адводзіцца 35 гадзін на год (1 гадзіна на тыдзень).

3. Мэтай вывучэння вучэбнага прадмета «Выяўленчае мастацтва» з’яўляецца фарміраванне мастацка-эстэтычнай і духоўна-маральнай культуры вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю сродкамі выяўленчага мастацтва (жывапіс, скульптура, графіка, архітэктура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, дызайн), авалоданне імі сацыякультурным вопытам.

4. Асноўнымі задачамі вывучэння вучэбнага прадмета «Выяўленчае мастацтва» з’яўляюцца:

фарміраванне ўстойлівых эмацыйна-станоўчых адносін і культуры ўспрымання эстэтычнага ў навакольнай рэчаіснасці, твораў выяўленчага, народнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, архітэктуры;

авалоданне выразнымі сродкамі выяўленчага мастацтва, мовай графічнай граматы і рознымі мастацкімі тэхнікамі і матэрыяламі ў розных відах выяўленчай дзейнасці (маляванне, аплікацыя, лепка) з апорай на ўзроставыя інтарэсы і зацікаўленасці вучняў;

выхаванне і развіццё правільнага ўспрымання формы, канструкцыі, велічыні, колеру прадметаў, іх становішча ў прасторы;

развіццё маторыкі і зрокава-рухальнай каардынацыі шляхам выкарыстання варыятыўных і шматразова паўтаральных графічных дзеянняў з ужываннем разнастайнага выяўленчага матэрыялу;

карэкцыя мыслення, маўлення, іншых псіхічных працэсаў, папярэджанне ўзнікнення другасных адхіленняў у развіцці (пераадоленне стэрэатыпнасці і інертнасці мыслення, ліквідацыя дэфіцыту сродкаў зносін і іншыя працэсы);

выхаванне культуры вучэбнай дзейнасці, уменне працаваць у зададзенай паслядоўнасці па інструкцыі і самастойна; выпрацоўка ўседлівасці, настойлівасці ў завяршэнні пачатай працы;

фарміраванне сацыяльнай, камунікатыўнай, пазнавальна-інфармацыйнай, выяўленчай кампетэнцый і ўзбагачэнне іх мастацка-эстэтычным зместам.

Дадзенай вучэбнай праграмай рэкамендуецца наступнае размеркаванне часу па раздзелах (у гадзінах):

| Віды работ | Клас | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | I | II | III | IV | V |
| Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва | 6 | 7 | 7 | 8 | 8 |
| Практычная мастацка-творчая дзейнасць: | 28 | 27 | 27 | 27 | 27 |
| Адлюстраванне на плоскасці | 18 | 19 | 19 | 18 | 16 |
| Лепка | 2 | 2 | 2 | 2 | 4 |
| Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць | 8 | 6 | 6 | 7 | 7 |
| Усяго: | 34 | 34 | 34 | 35 | 35 |

5. Метады і формы работы з вучнямі разнастайныя і варыятыўныя: расказ, гутарка, дыскусія, прымяненне ілюстрацый і дэманстрацыя нагляднага матэрыялу, прагляд мультымедыйных прэзентацый і аналіз прадстаўленага матэрыялу, самастойная работа з падручнікам, выкананне трэніровачных практыкаванняў, выкананне мастацка-творчых практычных работ; выкарыстанне інфармацыйных сродкаў навучання і нестандартных форм правядзення ўрокаў (напрыклад, урок-даследаванне, урок-падарожжа, урок-экскурсія, урок-гульня, урок-казка, інтэграваны ўрок і да таго падобныя формы ўрокаў); арганізацыя вучэбных экскурсій у музеі, на выставы, па горадзе, сустрэчы і гутаркі з мастакамі і іншыя формы працы з вучнямі. У працэсе навучання настаўнік мае магчымасць шырока прымяняць актыўныя метады навучання, сучасныя адукацыйныя тэхналогіі.

На ўроках выяўленчага мастацтва выкарыстоўваюцца вербальныя і невербальныя (жэсты, міміка) сродкі зносін, якія адпавядаюць вучэбнай сітуацыі і магчымасцям кожнага дзіцяці.

6. Рэалізацыя зместу дадзенай вучэбнай праграмы забяспечвае ўсебаковае развіццё асобы вучняў у працэсе далучэння да мастацкай культуры, фарміраванне маральна-эстэтычных норм і набыццё сацыяльнага вопыту, гатоўнасць да паспяховага пераходу на наступны ўзровень адукацыі. Дасягненнямі вучняў пры засваенні зместу дадзенай вучэбнай праграмы з’яўляюцца:

уяўленні пра выяўленчае мастацтва (віды, жанры, формы, агульныя і спецыфічныя асаблівасці), аб’екты навакольнага свету і яго разнастайнасць (раслінныя і геаметрычныя формы, колер, фактура і тэкстура матэрыялу), асновы выяўленчай граматы (тэхнікі малюнка, аплікацыі і лепкі, колеразнаўства (колеры і адценні, каларыт), мастацкія тэхнікі);

уменні выкарыстоўваць атрыманы досвед падчас ўспрымання, аналізу і ацэнкі твораў мастацтва, навакольнай рэчаіснасці, у працэсе ўласнай мастацка-творчай, гульнявой і працоўнай дзейнасці, паўсядзённых

сітуацыях.

# ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

### І КЛАС (34 гадзіны)

### Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва (6 гадзін)

Эстэтычнае ўспрыманне аб’ектаў і з’яў прыроды: назіранне за станам прыроды ў розныя поры года, за разнастайнасцю форм і колераў у прыродзе (кветкі, лісце, дрэвы). Параўнанне раслінных форм па форме, колеры, велічыні, знаходжанне падабенства і адрознення паміж імі.

Эстэтычнае ўспрыманне прадметнага свету: спалучэнне эстэтыкі знешняга выгляду вырабаў бытавога прызначэння і іх функцыянальных асаблівасцей.

Эстэтычнае ўспрыманне твораў мастацтва (мастацкія творы на выбар настаўніка): развіццё здольнасцей суперажываць і эмацыйна адгукацца на выразныя вобразы аб’ектаў і з’яў навакольнага свету, прадстаўленых у жывапісе, скульптуры, графіцы (ілюстрацыі).

Пазнаванне і распазнаванне ў ілюстрацыях выяў розных прадметаў, жывёл, раслін.

Народная гліняная цацка (беларуская цацка (сеніцкая гліняная свістулька), дымкаўская цацка). Сімвалічны сэнс і функцыя абярэга цацкі-свістулькі.

Прыкладны пералік твораў выяўленчага мастацтва

Жывапіс. І. Шышкін. «Раніца ў сасновым бары», «Зіма»; Ю. Васняцоў. «Алёнушка»; С. Каткоў. «Восеньскі пейзаж», «Лагойскі матыў»; Г. Вашчанка. «Перад адлётам», «Бульба»; І. Бродскі. «Апалае лісце»; В. Паленаў. «Залатая восень»; І. Левітан. «Залатая восень», «Вясна. Вялікая вада», «Зноў вясна»; С. Герасімаў. «Вярба квітнее»; І. Хруцкі. «Кветкі і плады»; С. Герус. «Зіма ў Мінску»; А. Кузьміч. «Полацкая Сафія»; В. Сумараў. «Іней»; М. Рамадзін. «Незамярзаючая рэчка»; П. Масленнікаў. «Сакавіцкі вечар»; А. Гугель. «Бягуць ручаі»; В. Цвірко. «Хлябы прыбраныя»; В. Бялыніцкі-Біруля. «Зялёны май», П. Крохалеў. «Вясна. Вяча» і іншыя работы (на выбар настаўніка).

Графіка. І. Білібін, У. Канашэвіч – ілюстрацыі да рускіх народных казак (на выбар настаўніка), казак А. С. Пушкіна (на выбар настаўніка); В. Валынец, А. Лось, Г. Паплаўскі, Н. Паплаўская, В. Славук, М. Селяшчук – ілюстрацыі да беларускіх народных казак (на выбар настаўніка); В. Суцееў – ілюстрацыі да аўтарскіх казак; Я. Чарушын – ілюстрацыі да

кніг «Розныя звяры», «Дзеткі ў клетцы».

Скульптура. В. Ватагін. «Мядзведзь», «Варона» і іншыя работы (на выбар настаўніка); І. Яфімаў. «Кошка з шарам», «Баран» і іншыя скульптуры (на выбар настаўніка); С. Канёнкаў. «Стары-палявічок»; А. Апякушын. «Помнік А.С. Пушкіну» і іншыя скульптуры (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

Архітэктура. Беларуская і руская хаты. Касцёл Святых Сымона і Алены ў Мінску. Сабор Пятра і Паўла ў Гомелі. Свята-Уваскрасенскі сабор у Барысаве. Серафіма-Сароўская царква ў Белаазёрску. Свята-Сімяонаўская царква ў Камянцы і іншыя архітэктурныя будынкі (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Народная гліняная цацка (беларуская цацка – сеніцкая гліняная свістулька, дымкаўская цацка).

Практычная мастацка-творчая дзейнасць (28 гадзін)

Адлюстраванне на плоскасці (18 гадзін)

Маляванне фарбамі (гуаш). Гарманічнае запаўненне аркуша паперы выявамі, вылучэнне цэнтра на аркушы паперы (з дапамогай настаўніка, апорных сімвалаў). Прыкладная тэматыка: рознакаляровыя кольцы, кветкі на градцы, каляровыя лесвічкі, снегавікі і да таго падобныя аб’екты.

Удасканаленне ўменняў вучняў свабодна, без напружання праводзіць ад рукі прамыя вертыкальныя, гарызантальныя і нахільныя лініі (паводле паказу). Прыкладная тэматыка: лесвічкі, акенцы, рамкі, шахматная дошка, арэлі і іншыя аб’екты.

Маляванне дугападобных, замкнутых кругавых ліній (паводле паказу). Прыкладная тэматыка: дым ідзе; б’е фантанчык; самалёт ляціць; хвалі, па якіх плыве караблік; скача мяч; скача жаба; матылёк пералятае з кветкі на кветку; наматаем клубок нітак; ланцужок з колцаў і іншыя аб’екты.

Маляванне прадметаў акруглай і прадаўгаватай формы: восеньскае лісце, садавіна і гароднiна (яблык, груша, агурок, морква) і іншыя прадметы.

Адрозненне і маляванне прадметаў квадратнай, прамавугольнай, круглай і трохвугольнай формы, перадача іх характэрных асаблівасцей. Прыкладная тэматыка: марскія сігнальныя сцяжкі (1–2 сцяжкі на адным аркушы), будзільнік круглай (квадратнай) формы, двухколерны мяч, тэнісная ракетка, нескладаныя па форме прадметы і да таго падобныя аб’екты.

Кампаноўка і маляванне на аркушы паперы некалькіх прадметаў, аб’яднаных агульным зместам. Прыкладная тэматыка: «Што бывае круглым» (развіваць уменне аб’ядноўваць прадметы па прыкмеце формы, практыкаваць у маляванні круглых форм, фарміраваць уменне аналізаваць

форму прадметаў), ілюстрацыя да казкі «Тры мядзведзі» і да таго падобная тэматыка.

Маляванне ўзораў з геаметрычных і раслінных форм па ўсім аркушы паперы, гарманічнае запаўненне аркуша паперы выявамі, вылучэнне цэнтра аркуша паперы (з дапамогай настаўніка, апорных сімвалаў).

Маляванне ўзораў з раслінных форм (фрызавы арнамент): паўтарэнне аднолькавых па форме або колеру элементаў. Выкананне дэкаратыўных кампазіцый (гуаш). Прыкладная тэматыка: «Восеньскі лістапад», «Рознакаляровыя кветкі», «Папараць-кветка», «Яблыня квітнее»; стварэнне фрызаў «Кветкі і матылі», «Агародніна і садавіна», «Кветкавыя матывы» (тэхніка аплікацыі, пячатання, з выкарыстаннем фларыстычных тэхнік).

Упрыгожванне беларускім геаметрычным арнаментам каўняра кашулі, паяска, фартуха і да таго падобных прадметаў (гуаш).

Афармленне віншавальных паштовак (да Дня абаронцы Айчыны, Новага года, 8 Сакавіка, Дня Перамогі, на іншыя значныя святы і даты).

Паняцце аб асноўных колерах.

Лепка (2 гадзіны)

Лепка пладоў (яблык, груша, сліва, агурок).

Лепка цацкі ў падарунак блізкім людзям (гліна, пластылін). Дэкаратыўнае вырашэнне вобраза пры лепцы цацак.

Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць (8 гадзін)

Прыёмы выканання дэкаратыўнай кампазіцыі ў тэхніцы «фларыстыка» і «манатыпія» (на выбар настаўніка).

Віды арнаменту. Роспіс узорам гатовых сілуэтаў прадметаў посуду, адзення (гуаш); вылепленай цацкі (гуаш).

Віды аплікацыі (прадметная, сюжэтная, дэкаратыўная). Прыёмы выразання элементаў аплікацыі (на выбар настаўніка). Выраб фрызаў «Рознакаляровыя кветкі», «Сняжынкі» (аплікацыя; калектыўная работа).

Прыёмы выканання кампазіцый, вырабаў у тэхніцы «папяровая пластыка»: «Запрашальны білет», «Віншавальная паштоўка» (да Дня абаронцы Айчыны, Новага года, 8 Сакавіка, Дня Перамогі, на іншыя значныя святы і даты).

Чаканыя вынікі

Вучні маюць уяўленні аб:

форме, велічыні, асноўных колерах;

мастацкіх матэрыялах, інструментах і прыладах (альбом, папера, пэндзлі, фарбы, алоўкі) і асноўныя правілы работы з імі.

Уменні (прадметныя):

размяшчаць аркуш паперы з дапамогай настаўніка (па вертыкалі або гарызанталі);

размяшчаць выяву асобна ўзятага прадмета пасярэдзіне аркуша

паперы;

пазнаваць і паказваць у ілюстрацыях кніг і ў рэпрадукцыях мастацкіх карцін знаёмыя аб’екты і характэрныя прыкметы пораў года, якія перадаюцца сродкамі выяўленчага мастацтва;

называць і паказваць геаметрычныя формы: круг, авал, квадрат, прамавугольнік, трохвугольнік; асноўныя колеры; велічыні (вялікі-маленькі, высокі-нізкі, доўгі-кароткі, шырокі-вузкі), арыентавацца ў прасторы аркуша паперы (сярэдзіна (цэнтр));

маляваць з дапамогай настаўніка аб’екты і з’явы навакольнай рэчаіснасці, выкарыстоўваючы сродкі выразнасці (лінія, форма, колер);

маляваць узоры з геаметрычных і раслінных форм у паласе і квадраце (сумесныя дзеянні, перайманне);

ляпіць з цэлага кавалка пластыліну;

працаваць у тэхніках «фларыстыка», «манатыпія», «папяровая пластыка» (з дапамогай настаўніка);

правільна падрыхтоўваць і прыбіраць у канцы заняткаў сваё працоўнае месца (з дапамогай настаўніка);

адзначаць у працы, што спадабалася, што не спадабалася (з дапамогай настаўніка).

Вучні прымяняюць у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

назвы геаметрычных форм, велічынь, колераў;

уменне працаваць традыцыйнымі мастацкімі матэрыяламі: алоўкамі, фарбамі (з дапамогай настаўніка);

элементарныя спосабы лепкі і трансфармацыі паперы ў розных тэхніках для стварэння выразных вобразаў (з дапамогай настаўніка).

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

магчымасць самавыяўлення сродкамі малявання (колер);

элементарныя эстэтычныя ўяўленні пра творы выяўленчага мастацтва, аб’екты і з’явы навакольнай рэчаіснасці;

практычныя выяўленчыя ўменні і навыкі, якія выкарыстоўваюцца ў мастацка-творчай дзейнасці (маляванне, лепка, аплікацыя).

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

пазнаваць і паказваць з дапамогай настаўніка творы выяўленчага мастацтва, дэманстраваць эмоцыі пры іх разглядзе;

ацэньваць вынікі ўласнай мастацка-творчай дзейнасці і аднакласнікаў (напрыклад, прыгожа, спадабалася, не спадабалася);

карыстацца атрыманымі практычнымі навыкамі ў паўсядзённым жыцці: заўважаць прыгажосць навакольнай прыроды, свету рэчаў, знаходзіць і паказваць характэрныя асаблівасці (колер, форма і да таго падобныя характарыстыкі), працаваць з мастацкімі матэрыяламі і інструментамі падчас стварэння вырабаў, паштовак, сувеніраў; выконваць элементарныя правілы культуры працы (арганізацыя і ўборка працоўнага

месца, акуратныя і беражлівыя адносіны да мастацкіх матэрыялаў і прылад).

## ІІ КЛАС (34 гадзіны)

### Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва (7 гадзін)

Эстэтычнае ўспрыманне навакольнага свету: назіранне за станам прыроды ў розныя поры года, разглядванне аб'ектаў прадметнага свету, твораў мастацтва. Выхаванне станоўча-эмацыйнай спагадлівасці на прыгажосць навакольнай рэчаіснасці і твораў розных відаў мастацтва.

Развіццё ўмення пазнаваць, паказваць і называць у навакольнай рэчаіснасці, ілюстрацыйным матэрыяле прапанаваныя аб'екты, з'явы і іх характэрныя прыкметы, функцыянальнае прызначэнне і ўзаемасувязь з чалавекам. Прыкладныя аб'екты для разглядання (прадметныя карцінкі, ілюстрацыі): аб'екты расліннага і жывёльнага свету (дрэвы, кусты, трава, кветкі, гародніна, садавіна, жывёлы), прадметнага свету (прадметы мэблі, адзення і да таго падобныя аб'екты), характэрныя прыкметы прыродных з'яў (лістапад, снегапад і да таго падобныя з'явы).

Віды і жанры выяўленчага мастацтва (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка). Эстэтычнае ўспрыманне твораў мастацтва (мастацкія творы на выбар настаўніка): развіццё здольнасці суперажываць і эмацыйна адгукацца на выразныя вобразы аб'ектаў і з'яў навакольнага свету, прадстаўленыя ў жывапісе, графіцы (малюнак, ілюстрацыі), скульптуры. Развіццё ацэначнай дзейнасці пры ўспрыманні мастацкіх твораў: вылучэнне колеру, характарыстыка знешняга выгляду герояў. Выкарыстанне музыкі, паэзіі, мастацкай прозы (ілюстрацыйны і літаратурны матэрыял на выбар настаўніка).

Увядзенне вучняў у свет народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, далучэнне да прыгажосці, якая ствараецца рукамі народных умельцаў. Эстэтычнае ўспрыманне вырабаў народнай творчасці. Прыкладныя аб'екты для разглядання: тканыя палавічкі, спадніцы, паясы, упрыгожаная вышыўкай кашуля, фартух і іншыя вырабы, яйкі-маляванкі, беларускія цацкі з гліны, саломы, ільну, дымкаўская цацка, беларускія размаляваныя маленькія дываны (макаткі), куфры і іншыя аб'екты. Сімвалічны сэнс і функцыя абярэга – беларускай глінянай цацкі-свістулькі. Адзінства формы прадмета і яго ўпрыгожвання (огаўскія куфры).

Эстэтычнае ўспрыманне архітэктурных збудаванняў Беларусі (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

Прыкладны пералік твораў выяўленчага мастацтва

Жывапіс. І. Шышкін. «Карабельны гай», «Дождж у дубовым лесе»

(«Дубы. Вечар»); А. Васняцоў. «На раллі. Вясна», «Вось табе і бацькаў абед!»; К. Юон. «Сакавіцкае сонца», «Канец зімы. Поўдзень»; А. Камароў. «Звяры нашых лясоў» (альбом); В. Паленаў. «Зарослая сажалка»; С. Купрыянаў. Ілюстрацыі да зборніка Я. Ф. Трутневай «Зіма, вясна, лета, восень»; С. Герус. «Зіма ў Мінску»; Л. Дударэнка. «Зімовы дзень»; С. Жукоўскі. «Зімовы пейзаж»; В. Сумараў. «Іней»; М. Рамадзін. «Незамярзаючая рэчка»; В. Цвірко. «Прыпяць. Вясна»; В. Бялыніцкі-Біруля. «Ранняя вясна», «Зялёны май», «Дача ў садзе»; В. Данілаў. «Вясновыя рытмы. Эцюд»; І. Хруцкі «Кветкі і садавіна» і іншыя работы (на выбар настаўніка).

Графіка. Т. Маўрына, В. Васняцоў – ілюстрацыі да рускіх народных казак (на выбар настаўніка), казак А. С. Пушкіна (на выбар настаўніка); І. Яфімаў – афішы лялечнага тэатра (на выбар настаўніка); А. Шэвераў, В. Сідарава, У. Лукашык, Т. Беразенская, П. Татарнікаў – ілюстрацыі да беларускіх народных казак (на выбар настаўніка).

Скульптура. С. Сотнікаў. «Стары Хатабыч»; В. Ватагін. «Арангутан седзячы» і іншыя работы (на выбар настаўніка); І. Яфімаў. «Зебра», «Лань з дзіцянём» і іншыя скульптуры (на выбар настаўніка); С. Канёнкаў. Прадметы мэблі (фатэль у выглядзе лебедзя; столік з вавёрачкай, якая сядзіць на ім; фатэль у выглядзе скручанага ўдава і іншыя прадметы мэблі на выбар настаўніка) і іншыя работы (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Народная гліняная цацка (сеніцкая гліняная свістулька), саламяная і льняная цацкі (лялечкі-мотанкі, званочкі, птушкі). Дымкаўская цацка. Беларуская кераміка. Беларускія размаляваныя маленькія дываны (макаткі). Огаўскія куфры. Яйкі-маляванкі (афарбаваныя ў адзін колер). Ткацтва і вышыўка (беларускія ручнікі, посцілкі, паясы, кашулі, спадніцы і іншыя прадметы).

Архітэктура. Беларуская і руская хаты (жылыя пакоі, сенцы, камора і святліца, дэкор (аконная ліштва, франтоны ў выглядзе ззяння, сонца, кветкі, крыжа); Сабор Пятра і Паўла ў гарадах Мінску, Гомелі. Свята-Георгіеўская царква ў гарадах Лідзе, Нясвіжы, Віцебску, г. п. Смілавічы і іншыя архітэктурныя збудаванні (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

Практычная мастацка-творчая дзейнасць (27 гадзін)

Адлюстраванне на плоскасці (19 гадзін)

Маляванне прадметаў расліннага, жывёльнага і прадметнага свету фарбамі (гуаш) з дапамогай настаўніка. Размяшчэнне і малюнак 1-2 аб’ектаў, звязаных агульным зместам, на аркушы паперы, вылучэнне цэнтра аркуша паперы, выбар становішча аркуша ў залежнасці ад зместу малюнка або формы адлюстраванага аб’екта (з дапамогай настаўніка).

Перадача колеру, формы і велічыні адлюстраваных аб’ектаў.

Прыкладная тэматыка: «Восеньскі нацюрморт», «Дары лесу», «Гародніна і садавіна» і да таго падобныя работы.

Размалёўванне контурных фігур чалавека і жывёл (з дапамогай настаўніка). Прыкладная тэматыка: «Зімовыя забавы», «На птушыным двары», «Навагодні карагод» і іншыя работы.

Маляванне па тэме «Што бывае круглым (квадратным, трохвугольным, авальным)?» (пасля папярэдняй работы).

Маляванне ўзораў у паласе з паўторных раслінных элементаў (напрыклад, галінкі елкі, гірлянда кветак і да таго падобныя элементы). Маляванне ўзораў з раслінных форм у квадраце (гуаш): па краях квадрата (фрызавы арнамент) і ў цэнтры. Прыкладная тэматыка: «Беларуская макатка», дэкаратыўныя пано: «Букет кветак», «Купалле», «Квітнеючы сад» і да таго падобныя работы (пасля наведвання музеяў, разглядання распісных работ Л. Валеевай, Н. Клімауцкай і іншых майстроў; альбомаў, ілюстрацый у кнізе «Беларускі народны дэкаратыўны роспіс» (2005), аўтар Н. В. Пачынава і іншых аўтараў).

Упрыгожванне беларускім геаметрычным арнаментам сілуэтных форм прадметаў адзення. Прыкладная тэматыка: каўнер і рукавы кашулі, пояс, фартух, спадніца, рукавіца, сукенка і да таго падобныя прадметы адзення.

Маляванне геаметрычнага ўзору на тэму «Дымкаўскія ўзоры». Выкарыстанне прадметных сілуэтаў (баран, маленькі конь, певень і іншыя сілуэты жывёл).

Развіццё ўменняў называць і паказваць асноўныя (жоўты, чырвоны, сіні), ахраматычныя (белы, чорны) колеры. Выкарыстоўваць у малюнку зялёны, карычневы, аранжавы колеры.

Афармленне віншавальных паштовак (на значныя святы і даты), упрыгожванне памяшканняў да розных свят (Дзень ведаў, Дзень абаронцы Айчыны, Новы год, 8 Сакавіка, Дзень Перамогі).

Лепка (2 гадзіны)

Лепка фігур жывёл (з частак, з дапамогай настаўніка) паводле тыпу народнай цацкі (беларуская народная цацка, дымкаўская цацка).

Лепка і аздабленне прадметаў посуду, цацак (на выбар настаўніка, вучняў).

Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць (6 гадзін)

Стварэнне фрызаў для ўпрыгожвання класа: «Сябруюць дзеці ўсёй Зямлі», «Вясновыя кветкі» (аплікацыя з гатовых элементаў, калектыўная работа).

Выкананне эскіза роспісу пано, апрацоўчай дошкі, шкатулкі для рукадзелля (тэхніка аплікацыі з гатовых форм, на выбар вучняў).

Стварэнне аб’ёмнай скульптуры з прыроднага і непрыдатнага матэрыялу (папера, тканіна і іншыя матэрыялы): «Лесавічок», «Кікімара на балоце», «Дамавік» і да таго падобныя скульптуры.

Рэльефная кампазіцыя. «Пунсовая кветачка», «Папараць-кветка» і іншыя кампазіцыі (па меркаванні настаўніка; папяровая пластыка; калектыўнае пано).

Чаканыя вынікі

Вучні маюць уяўленні аб:

форме, велічыні, асноўных і ахраматычных колерах;

мастацкіх матэрыялах, інструментах, прыладах і асноўных правілах работы з імі;

сенсорных характарыстыках знаёмых аб’ектаў навакольнага свету (колер, форма, велічыня).

Уменні (прадметныя):

размяшчаць з дапамогай настаўніка выяву асобна ўзятага прадмета пасярэдзіне аркуша паперы, вылучаць галоўнае колерам, велічынёй;

арыентавацца на плоскасці аркуша паперы і ў гатовай геаметрычнай форме;

пазнаваць і паказваць у ілюстрацыях кніг і рэпрадукцыях мастацкіх карцін знаёмыя аб’екты і характэрныя прыкметы пораў года;

падрыхтоўваць і прымяняць неабходныя па тэме мастацкія матэрыялы, інструменты і прылады (з дапамогай настаўніка);

пазнаваць, паказваць і называць у выявах геаметрычныя формы: круг, авал, квадрат, прамавугольнік, трохвугольнік; велічыні (вялікі-маленькі, высокі-нізкі, доўгі-кароткі, шырокі-вузкі), арыентавацца ў прасторы аркуша паперы з дапамогай настаўніка (сярэдзіна, правы і левы бакі);

пазнаваць, паказваць і называць колеры: чырвоны, жоўты, сіні, зялёны, чорны, белы; суадносіць іх з колерам пэўнага аб’екта або яго выявы (з дапамогай настаўніка);

маляваць узоры з геаметрычных і раслінных форм у паласе і квадраце (па пераймані, узоры);

ляпіць з дапамогай настаўніка аб’екты навакольнага свету (цацкі, жывёл, прадметы посуду і іншыя аб’екты);

ствараць аплікацыйныя работы ў выглядзе фрыза, ляпныя работы з прыроднага і непрыдатнага матэрыялу (папера, тканіна і іншыя матэрыялы);

працаваць у тэхніцы «папяровая пластыка» пры стварэнні калектыўных пано;

прыбіраць у канцы заняткаў сваё працоўнае месца (з дапамогай настаўніка);

параўноўваць з дапамогай настаўніка сваю работу з узорам.

Вучні ведаюць і прымяняюць у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

мастацкія матэрыялы і інструменты (пэндзаль, аловак, папера), прыёмы і спосабы стварэння выяў у працэсе малявання, лепкі, аплікацыі.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

набыты вопыт мастацкай дзейнасці: удзельнічаць у конкурсах, выставах; пад кіраўніцтвам і з дапамогай настаўніка ажыццяўляць дэкаратыўна-афарміцельскую дзейнасць ва ўстанове адукацыі.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

паказваць і (або) называць з дапамогай настаўніка добра знаёмыя творы выяўленчага мастацтва;

вызначаць эмацыйны стан (сумны, вясёлы) намаляваных на карціне аб'ектаў (з дапамогай настаўніка, з выкарыстаннем альтэрнатыўных сродкаў камунікацыі);

карыстацца атрыманымі практычнымі навыкамі ў паўсядзённым жыцці ў розных асяроддзях і сферах жыццядзейнасці (бытавая, асобасная, сацыяльна-забаўляльная): разглядаць, пазнаваць аб'екты і з'явы навакольнай рэчаіснасці, разглядаць з дапамогай настаўніка творы мастацтва; выконваць элементарныя правілы культуры працы (арганізацыя і ўборка працоўнага месца, акуратныя і беражлівыя адносіны да мастацкіх матэрыялаў і прылад); эмацыйна ўдзельнічаць у ацэнцы работ аднакласнікаў, з дапамогай альтэрнатыўнай камунікацыі паказваць сваё стаўленне да выкананай працы.

## III КЛАС (34 гадзіны)

### Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва (7 гадзін)

Эстэтычнае ўспрыманне аб'ектаў і з'яў прыроды, прадметнай рэчаіснасці. Выхаванне эмацыйна-эстэтычных пачуццяў, пачуцця прыгожага ў разнастайных прадметах і з'явах прыроднага характару. Вершы пра прыроду, музычныя творы, звязаныя з карцінамі прыроды (ілюстрацыйны, музычны і літаратурны матэрыял на выбар настаўніка).

Знаёмства з работамі вядомых мастакоў-жывапісцаў (на выбар настаўніка). Нацюрморт (адлюстраванне гародніны, садавіны, кветак, прадметаў побыту). Падвядзенне да разумення адзінства зместу (пра што твор) і некаторых сродкаў выразнасці (як намалявана) у розных відах мастацтва.

Знаёмства з графікай (кніжныя ілюстрацыі), яе выразнымі сродкамі (лінія, пляма, колер). Сувязь ілюстрацыі са зместам твора (на прыкладах дзіцячых казак, кароткіх апавяданняў) (ілюстрацыйны і літаратурны матэрыял на выбар настаўніка).

Увядзенне вучняў у свет народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, далучэнне да прыгажосці, якая ствараецца рукамі народных умельцаў. Эстэтычнае ўспрыманне вырабаў народнай творчасці. Паняцце аб дэкаратыўным абагульненні формы.

Эстэтычнае ўспрыманне архітэктурных збудаванняў Беларусі (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

Прыкладны пералік твораў выяўленчага мастацтва

Жывапіс. М. Казакевіч. «Нарачанская зямля»; Ф. Талстой. «Букет кветак, матылёк і птушачка»; В. Вярсоцкі. «Дарогі Міншчыны»; В. Бялыніцкі-Біруля. «Зімовы сон»; К. Пятроў-Водкін. «Маці», «Ранішні нацюрморт»; В. Цвірко. «Блакітны дзень»; І. Айвазоўскі. «Чорнае мора», «Хваля»; С. Каткоў. «Хутар Альбуць»; Б. Залкінд. «Вуліца ў Вільні»; І. Левітан. «Залатая восень»; Я. Зайцаў. «Партрэт юнага партызана»; З. Серабракова. «Каця з нацюрмортам»; М. Апіок. «Ружы»; Рэмбрант. «Аўтапартрэт»; Рубенс. «Партрэт маладой жанчыны»; Хальс. «Цыганка»; Караваджа. «Юнак з лютняй»; Снайдэрс. «Фруктовая крама»; Хеда. «Нацюрморт. Сняданак» і іншыя творы жывапісу (на выбар настаўніка).

Графіка. М. Качаргін, А. Канеўскі, В. Суцееў, В. Славук, Т. Маўрына, У. Фаворскі, М. Селяшчук, А. Лось, Ю. Васняцоў, Я. Рачоў, Л. Уладзімірскі, Ю. Алісевіч, В. Шаранговіч, Т. Шэлест, Т. Сучкова, У. Даўгяла – ілюстрацыі да рускіх і беларускіх народных казак (на выбар настаўніка), аўтарскіх казак А. С. Пушкіна, братоў Грым, Х.-К. Андэрсана, Я. Пермяка, Ш. Перо, Р. Кіплінга, С. Аксакава і іншых пісьменнікаў (на выбар настаўніка).

Скульптура. А. Бембель. «Герой Савецкага Саюза Мікалай Гастэла», «9 мая 1945 г.» (гарэльеф для Манумента Перамогі ў Мінску); М. Врубель. «Садко»; В. Ватагін. «Мядзведзь, які балансуе на шары», «Мядзведзь буры»; І. Яфімаў. «Вепр», «Сокал»; А. Шатэрнік. «Каляды»; А. Глебаў. «Янка Купала», «Францыск (Георгій) Скарына» і іншыя скульптуры (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Салома- і лозапляценне (кошыкі, цацкі і дэкор з саломы, шкатулкі). Ткацтва і вышыўка (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна). Кераміка (хатняе начынне і інтэр’ерныя размаляваныя вырабы). Яйкі-маляванкі, яйкі-крапанкі (на шкарлупіне малююцца плямкі, крапінкі, палоскі). Роспіс па дрэве (огаўскія куфры) і да таго падобныя матэрыялы (на выбар настаўніка).

Архітэктура. Сучасныя жылыя і грамадскія архітэктурныя збудаванні (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна). Кафедральны сабор Святога Францыска Ксаверыя (Фарны касцёл) у Гродна. Свята-Мікалаеўскі гарнізонны сабор у Брэсце. Сабор Святой Варвары ў Віцебску і іншыя архітэктурныя збудаванні (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

Практычная мастацка-творчая дзейнасць (27 гадзін)

Адлюстраванне на плоскасці (19 гадзін)

Маляванне прадметаў рознай формы, велічыні, перадача ў малюнку іх асноўных уласцівасцей.

Фарміраванне ўменняў:

размяшчаць выявы на аркушы паперы (вертыкальна, гарызантальна) адпаведна яго прасторавым характарыстыкам (напрыклад, фігура чалавека, выява дрэва, пірамідкі – вертыкальнае размяшчэнне малюнка на аркушы паперы; партфель, калыска, кошка, што спіць, – гарызантальнае размяшчэнне малюнка на аркушы паперы);

размяшчаць сілуэтныя формы, шаблоны аб'ектаў, якія адлюстроўваюцца, пошукавым перамяшчэннем на плоскасці аркуша паперы, фланелеграфа, дошкі (трэніровачныя практыкаванні);

улічваць суразмернасць плоскасці аркуша з адлюстраванымі аб'ектамі, іх формай і колькасцю (адзінкавыя аб'екты адлюстроўваюцца буйна, некалькі аднастайных прадметаў – драбней (цукеркі, ягады і іншыя прадметы);

адлюстроўваць аб'екты, якія складаюцца з 2–3 асноўных частак, аднолькавых і розных па форме і велічыні. Прыкладная тэматыка: «Мая любімая цацка» (піраміда, неваляшка, грузавік), «Рыбка», «Кактус у вазоне», «Святлафор», «Каляска», «Цукеркі», «Чорныя парэчкі і агрэст», «Малаток і лапата» і да таго падобныя работы;

маляваць на аснове назіранняў ліставыя і хваёвыя дрэвы, кусты, іх характэрныя асаблівасці формы і канструкцыі (бяроза танкаствольная, стройная, з гнуткімі галінамі; дуб магутны, галіны моцныя; хвоя высокая, галіны размешчаны ўверсе);

пазнаваць, называць і выкарыстоўваць у выяўленчай дзейнасці асноўныя, састаўныя, ахраматычныя колеры, перадаваць форму, прапорцыі і канструкцыю адлюстраваных аб'ектаў;

замалёўваць выявы ў межах контуру, праводзячы лініі і мазкі ў патрэбным кірунку, падкрэсліваючы асаблівасці формы аб'ектаў.

Маляванне фігуры чалавека і жывёл (з дапамогай настаўніка, на аснове апорных схем).

Маляванне транспартных сродкаў (самалёт, машына, параход і іншы транспарт). Фарміраванне ўмення пачынаць маляванне транспартнага аб'екта з адной формы, паступова дапаўняючы яе неабходнымі дэталямі і элементамі.

Маляванне разнастайных аб'ектаў і з'яў навакольнага свету з дапамогай нетрадыцыйных мастацкіх матэрыялаў і тэхнік: «пальчыкавы жывапіс», «манатыпія», «калаж», «фотатыпія» (спалучэнне акварэлі і васковай крэйды); тэхніка друку (з выкарыстаннем штампаў з розных

матэрыялаў: паралон, гародніна, згорнутая ў рулон тканіна і да таго падобныя матэрыялы) і іншыя тэхнікі.

Маляванне 2–3 аб’ектаў, звязаных агульным зместам. Фарміраванне ўменняў вылучаць цэнтр аркуша паперы, выбіраць становішча аркуша ў залежнасці ад зместу малюнка або формы адлюстраванага аб’екта, вызначаць размяшчэнне аб’ектаў адносна адзін аднаго (уверсе-унізе, злева-справа, побач, каля, пасярэдзіне). Перадача ў кампазіцыі характэрных асаблівасцей будовы фігуры чалавека і жывёл (канструкцыя, прапорцыі).

Маляванне дрэў, іх характэрных асаблівасцей (форма, канструкцыя). Маляванне на аснове назіранняў: «Зімовы лес», «Чароўныя дрэвы», «Магутны дуб», «Стройная бярозка» (аловак, фламастар, гуаш). Стварэнне кампазіцый «Дрэвы восенню», «Надышла зіма» (пасля прачытання вершаў і разглядання жывапісных тэматычных карцін пра поры года – на выбар настаўніка, вучняў).

Ілюстраванне казак (на выбар настаўніка, вучняў).

Маляванне ўзораў у паласе, квадраце, крузе (гуаш). Развіццё ўменняў паўтараць, чаргаваць два элементы ўзору (арнаменту), развіваючы пачуццё рытму. Прыкладныя тэмы: «Узор у крузе з лісця (ягад, кветак)», «Упрыгожванне сурвэткі», «Беларуская макатка», «Маленькі куфэрак».

Складанне арнаменту з геаметрычных форм, упісаных адна ў другую. Выкарыстанне ва ўзорах асноўных і састаўных колераў (чырвоны, жоўты, зялёны, сіні, карычневы, аранжавы, фіялетавы). Прыкладныя тэмы: «Дарожныя знакі» (маляванне дарожных знакаў (дапускаецца з дапамогай трафарэтаў) для гульняў на правілы дарожнага руху), «Дапаможам малышам знайсці дарогу дадому» (дапускаецца маляванне з дапамогай трафарэтаў, размалёўванне стрэлак (трохвугольнік у крузе (квадраце)), «Шпакоўні для птушак» (маляванне геаметрычнай формы (акенца для птушак) у іншай, большай па памеры форме (сама шпакоўня)).

Удасканаленне тэхнікі размалёўвання выявы (раўнамернае накладванне рысак без залішняга націскання ў адным напрамку, не выходзячы за контур).

Развіццё элементарных творчых здольнасцей: выраб і ўпрыгожанне ўзорам (арнаментам) сілуэтных форм, якія імітуюць прадметы побыту, адзення, абутку. Маляванне раслінных, раслінна-геаметрычных, геаметрычных арнаментаў на формах рознай канфігурацыі, выкарыстанне беларускіх мастацкіх тэхнік («цацкаванне», «фляндроўка»). Прыкладныя заданні: упрыгожым апрацоўчую дошку, узор для абруса, сурвэткі (круглая або квадратная), дымкаўскія цацкі, рознакаляровыя кафлі, роспіс яек (яйкі-крапанкі), узорныя арнаменты огаўскіх куфраў і да таго падобныя заданні.

Фарміраванне элементарнай мастацка-афарміцельскай і дэкаратыўнай дзейнасці (афармленне віншавальных паштовак, упрыгожванне памяшканняў да розных свят, выстаў, падрыхтоўка

атрыбутаў і элементаў дэкарацый да ўрачыстасцей і да таго падобная дзейнасць).

Лепка (2 гадзіны)

Лепка па назіранні, прадстаўленні фігуры чалавека, жывёлы (тэматыка па меркаванні настаўніка).

Лепка жывёл спосабам выцягвання дэталей з цэлага камяка (пры стварэнні дэталей: дзюбы, хваста, чубка, плаўніка).

Лепка рэльефу: птушкі, рыбы, узор з раслінных форм (пластычная сувязь элементаў, перадача руху, суадносіны элементаў).

Складанне невялікіх скульптурных груп (тэматыка па меркаванні настаўніка; калектыўная работа).

Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць (6 гадзін)

Выразанне па папярэдне прамаляваным контуры складзенай удвая паперы (тэматыка – сіметрычныя аб’екты бліжэйшага асяроддзя і прыроды). Стварэнне фрызаў на розныя тэмы: гірлянда кветак, карагод матылькоў, званочкі-бразготкі і іншыя работы.

Складанне фігур і кампазіцый з засушанай травы, лісця, кветак (з улікам дэкаратыўнага абагульнення форм, выкарыстання фактуры і формы прыродных матэрыялаў (манатыпія, фларыстыка)).

Лепка і роспіс фігурак абагульненай формы паводле тыпу народных гліняных цацак (на выбар вучняў).

Чаканыя вынікі

Вучні маюць уяўленні аб:

форме, велічыні, асноўных і ахраматычных колерах;

назвах мастацкіх матэрыялаў, інструментаў, прылад і асноўных правілах работы з імі;

агульных і тыповых, некаторых індывідуальных прыкметах прадметаў, з’яў прыроды і чалавека (разнастайнасць форм, велічынь, прапорцый, фактуры; цёплая і халодная гама).

Уменні (прадметныя):

перадаваць характэрныя асаблівасці форм і памераў прадметаў;

карыстацца пэндзлем і фарбамі, змешваць фарбы;

упрыгожваць плоскія і аб’ёмныя прадметы ўзорам, арнаментам;

беражліва адносіцца да прадметаў мастацтва, мастацкіх матэрыялаў, прылад і сваіх работ;

маляваць, ляпіць і ствараць аплікацыі па ўзоры, уяўленні (з дапамогай настаўніка);

карыстацца нажніцамі, прыёмамі сіметрычнага выразання;

ствараць кампазіцыі з засушанай травы, лісця, кветак у тэхніцы «фларыстыка»;

правільна падрыхтоўваць і прыбіраць у канцы заняткаў сваё

працоўнае месца (па інструкцыі настаўніка);

удзельнічаць у калектыўнай рабоце;

даваць простыя ацэначныя меркаванні з дапамогай настаўніка пры эстэтычным успрыманні аб’ектаў рэчаіснасці і твораў мастацтва, падчас аналізу сваёй работы і работ аднагодкаў (напрыклад, прыгожа, непрыгожа, прыгожа ўбраны, правільна, няправільна, такі, не такі, прыгожы, таму што…, не такі, таму што…).

Вучні прымяняюць у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

розныя мастацкія тэхнікі, прыёмы і спосабы стварэння выяў для вырашэння творчай задумы ў розных відах мастацка-творчай і тэатральна-гульнявой дзейнасці;

правілы бяспекі падчас карыстання мастацкімі інструментамі і матэрыяламі, пры ўборцы і размяшчэнні іх у месцах захоўвання;

правілы паводзін пры ўспрыманні твораў выяўленчага мастацтва і тэхніку бяспекі пры арганізацыі ўласнай практычнай мастацка-творчай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

набыты вопыт мастацкай дзейнасці: удзельнічаць у калектыўнай рабоце, конкурсах, выставах, тэатральна-гульнявой дзейнасці (падрыхтоўка атрыбутаў, куліс, дэкарацый); пад кіраўніцтвам і з дапамогай настаўніка ажыццяўляць дэкаратыўна-афарміцельскую дзейнасць ва ўстанове адукацыі.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

пазнаваць, паказваць і называць эмацыйны стан намаляваных на карціне аб’ектаў (з дапамогай настаўніка);

пазнаваць, паказваць і называць значныя аб’екты культурнай спадчыны сваёй краіны і роднага горада, выкарыстоўваючы фонавую лексіку (з дапамогай настаўніка);

знаходзіць з дапамогай настаўніка неабходную для выканання работы інфармацыю ў матэрыялах падручніка, рабочым сшытку і да таго падобных крыніцах;

ацэньваць вынікі ўласнай мастацка-творчай дзейнасці і аднакласнікаў (напрыклад, прыгожа, непрыгожа, акуратна, падобна да ўзору);

карыстацца атрыманымі практычнымі навыкамі ў паўсядзённым жыцці, у розных відах мастацка-творчай і тэатральна-гульнявой дзейнасці (з дапамогай настаўніка).

## IV КЛАС (35 гадзін)

### Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва (8 гадзін)

Эстэтычнае ўспрыманне аб’ектаў і з’яў прыроды (літаратурны і

выяўленчы матэрыял на выбар настаўніка: вершы пра прыроду беларускіх паэтаў, музычныя творы, звязаныя з карцінамі прыроды, арганізацыя экскурсій, выкарыстанне мультымедыйных прэзентацый).

Знаёмства з работамі вядомых мастакоў-жывапісцаў (на выбар настаўніка). Нацюрморт (малюнак гародніны, садавіны, кветак, прадметаў побыту). Пейзаж (малюнак прыроды).

Выражэнне рознага настрою (радасць, сум, трывога, гора). Колер і яго адценні, іх гучнасць, лёгкасць, празрыстасць у творах жывапісу беларускіх і замежных мастакоў (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Графіка. Выразныя сродкі графікі (лінія, пляма, колер). Сувязь ілюстрацыі са зместам твора (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Скульптура. Выразныя сродкі скульптуры (аб'ём, форма, паварот, сілуэт), матэрыял (мармур, бронза, косць, дрэва), фактура (гладкая, шурпатая паверхня). Скульптуры беларускіх і замежных майстроў. Дробная пластыка, драўляная скульптура, разьба па косці (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка, вучняў).

Архітэктура. Архітэктурныя помнікі Беларусі (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна). Ахова прыроды, помнікаў культуры і гістарычных выдатных мясцін свайго рэгіёна.

Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, яго выразныя сродкі: абагульненасць формы, рытмічнае чаргаванне ўзораў, яркасць колеру. Сувязь формы з аздабленнем і прызначэннем прадмета. Творы народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: вырабы Огава, Івянца, Давыд-Гарадка, Жостава, Гжэлі, Хахламы; беларускія тканыя «посцілкі» і паясы, вырабы з саломкі і лёну (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Прыкладны пералік твораў выяўленчага мастацтва

Жывапіс. І. Айвазоўскі. «Зімовыя пейзажы», «Бура», «Дзявяты вал»; У. Баравікоўскі «Партрэт Лапухіной»; К. Брулоў. «Вершніца»; Б. Кустодзіеў. «Купчыха за чаем»; В. Цвірко. «Сакавік»; І. Шышкін. «Сосны, асветленыя сонцам»; І. Карасёў. «Залатая восень»; В. Васняцоў. «Алёнушка», «Тры асілкі»; А. Рылоў. «У блакітным прасторы»; А. Бархаткоў, «Першая песенька», «Поўдзень на сенажаці», «Вясна на Нёмане», «Красавіцкі дзень»; М. Чэпік. «На Івана Купала» і іншыя творы жывапісу (на выбар настаўніка).

Графіка. Б. Дзехцяроў, М. Усцінаў, Ю. Васняцоў, Л. Уладзімірскі, М. Радлаў, У. Савіч, У. Пашчасцьеў, А. Кашкурэвіч, Н. Сустава, М. Казлоў, Б. Забораў, У. Александровіч, В. Мікіта – ілюстрацыі да рускіх і беларускіх народных казак (на выбар настаўніка), аўтарскіх мастацкіх твораў А.С. Пушкіна, братоў Грым, Х.-К. Андэрсана, В. Высотскай, Ю. Ермалаева, А. Шыбаева, В. Берастава, Я. Коласа, Ю. Коваля,

Ю. Тувіма, М. Прышвіна, Г. Сапгіра, У. Ліфшыца, Б. Захадэра, С. Маршака і іншых пісьменнікаў (на выбар настаўніка).

Скульптура. В. Ватагін. «Сава белая палярная», «Філін», «Лісіца з цецеруком», «Пясец з белай курапаткай», «Мядзведзь буры», «Мядзведзь белы», «Мядзведзь тыбецкі»; І. Яфімаў. «Дэльфін», «Рыба»; З. Азгур. «Слава загінуўшым героям» (гарэльеф Манумента Перамогі ў Мінску); У. Жбанаў. «Незнаёмка», «Дзяўчынка з парасонам»; мемарыяльныя помнікі і іншыя скульптуры (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Салома- і лозапляценне (кошыкі, цацкі і дэкор з саломы, шкатулкі і іншыя прадметы). Ткацтва і вышыўка (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна). Кераміка (хатняе начынне і інтэр’ерныя размаляваныя вырабы). Выцінанкі. Яйкі-пісанкі (з арнаментальным або сюжэтным малюнкам). «Івянецкія ўзоры», «Огаўскія куфры», «Слуцкія паясы», «Петрыкаўскі роспіс», «Жостаўскія падносы», «Хахламскі роспіс», «Гжэльскі фарфор» (на выбар настаўніка, вучняў).

Архітэктура. Сучасныя жылыя, прамысловыя і грамадскія архітэктурныя збудаванні (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна). Касцёл Найсвяцейшай Тройцы (Св. Роха) у Мінску. Касцёл Святога Роха ў Гродна. Кафедральны каталіцкі касцёл Езуса Міласэрнага ў Віцебску. Кафедральны сабор Пятра і Паўла ў Гомелі і іншыя архітэктурныя збудаванні (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

## Практычная мастацка-творчая дзейнасць (27 гадзін)

### Адлюстраванне на плоскасці (18 гадзін)

Маляванне прадметаў рознай формы, велічыні, перадача ў малюнку галоўнай формы, яе частак, іх узаемнага размяшчэння. Прыкладная тэматыка: вымпел з выявай ракеты, пірамідка, папяровая шкляначка, пенал, каструля, шафа, насценны гадзіннік, пабудовы з элементаў будаўнічага матэрыялу, сталярных або слясарных прылад, прадметаў сіметрычнай формы (настольная лямпа, раскрыты парасон) і да таго падобная тэматыка.

Маляванне з натуры гароднiны і садавіны, лісця дрэў, кустоў на выбар настаўніка (раздатачны матэрыял).

Маляванне відаў транспарту. Прыкладная тэматыка: цацка-аўтобус, цацка-грузавік (фургон), «На выставе машын», «На тралейбусным прыпынку», «Новенькі трактар» (гуаш, акварэль, фламастары) і да таго падобная тэматыка. Маляванне фігуры чалавека і жывёл (з дапамогай настаўніка, з выкарыстаннем шаблона або рухомай мадэлі фігуры чалавека). Асноўныя асаблівасці будовы цела чалавека і жывёлы, размяшчэння частак цела (тулава, канечнасці, шыя, галава). Перадача вертыкальнага і нахільнага размяшчэння прадметаў у малюнку (стаяць, ляжаць). Прыкладная тэматыка: «Дзед і ўнучка», «Пасядзім на лавачцы», «Кошка спалохалася сабакі», «Зайчык на задніх лапах», «Танцуючы

мядзведзь», «Жывёлы на арэне цырка» і да таго падобная тэматыка.

Маляванне дамоў рознай канструкцыі. Прыкладная тэматыка: «Дамы на нашай вуліцы», «Будуюць новы дом», «Наваселле», «Мост праз раку», «Казачны замак» і да таго падобная тэматыка.

Стварэнне простых сюжэтных кампазіцый (гуаш, акварэль, крэйда, фламастары). Поўнае выкарыстанне паверхні аркуша паперы для перадачы мастацкай задумы, зместу. Перадача планаў прасторы, размяшчэнне асноў блізкіх прадметаў ніжэй, далёкіх – вышэй. Прыкладная тэматыка: «Вясновы луг», «Збор ураджаю», «Катанне з горкі» «На катку», «На пляжы», «Трактары ў полі» і таго падобная тэматыка.

Маляванне па памяці ўражанняў ад вобразаў прыроды: маляванне кветак, лісця, пладоў (мастацкія матэрыялы на выбар вучняў). Перадача характэрнай афарбоўкі прадметаў, пазнаванне і называнне асноўных і састаўных колераў прадметаў. Эмацыйны, вобразны змест колеру. Прыкладная тэматыка: «Лета (восень) у вёсцы (парку)», «Навальніца насоўваецца», «Заход», «Зіма (вясна) у горадзе (сяле)», «Дажынкі», «Святочны салют» і да таго падобная тэматыка.

Маляванне на тэмы «Прыйшла вясна», «Першы снег», «Квітнеюць сады», «Вось і лета настала!» пасля разгляду ілюстрацый і рэпрадукцый карцін вядомых мастакоў (на выбар настаўніка).

Замалёўкі па памяці ўражанняў ад вобразаў народнай цацкі: матрошка, дымкаўская цацка, цацка з саломкі (гуаш).

Складанне дэкаратыўных кампазіцый у прамавугольніку і квадраце. Фарміраванне ўменняў размяшчаць узор сіметрычна, запаўняючы сярэдзіну, вуглы, краі; размяшчаць дэкаратыўныя элементы ў крузе на восевых лініях (дыяметрах) у цэнтры і па краях; размалёўваць фарбай (гуаш) і алоўкамі, захоўваючы контуры, элементы арнаменту; падбіраць гарманічнае спалучэнне колераў. Прыкладная тэматыка: «Дыванок для цацак»; пано для ўпрыгожвання класа: «Кветкі і матылі», «Сняжынкі, якія танцуюць», «Гірлянда з кветак і пладоў»; «Упрыгожым узорам стальніцу квадратнай формы», «Распісная талерка» (навагодняя тэматыка), «Упрыгожым узорам з ягад і лісця блюда (талерку, цукерніцу, цукарніцу)» і да таго падобная тэматыка.

Дэкаратыўнае абагульненне формы – складанне кампазіцый з засушаных траў, лісця, кветак. Прыкладная тэматыка: «Восеньскі букет», «Нацюрморт» і да таго падобная тэматыка.

Роспіс гатовых фігурак (дапускаецца лепка вырабаў), сілуэтных форм паводле тыпу народных гліняных цацак. Прыкладная тэматыка: «Алень – Залатыя рогі», «Баранчык», «Конік (маленькі конь)» і да таго падобная тэматыка.

Дэкаратыўна-афарміцельская дзейнасць па ўпрыгожванні памяшканняў, падрыхтоўцы выстаў, свят.

Лепка (2 гадзіны)

Лепка па ўяўленні (тэматыка і выбар мастацкіх матэрыялаў па меркаванні настаўніка).

Апрацоўка паверхні (фактура) як сродак выразнасці вобраза: рэльефы «Залатая рыбка», «Жар-птушка», «Паўлін».

Лепка рэльефу ў зададзеным фармаце (медаль, медальён (талісман)).

Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць (7 гадзін)

Асаблівасці выканання вырабаў у тэхніцы «аплікацыя» і прыёмы яе выканання (тэматыка па меркаванні настаўніка; аднатонная і каляровая папера).

Выцінанка (ажурныя ўзоры з паперы). Знаёмства з кампазіцыйнымі разнавіднасцямі і прыёмамі выканання («Дрэва жыцця», «Герб майго горада», «Запрашальны білет», «Віншавальная паштоўка»).

Мастацкае канструяванне: прыёмы трансфармацыі паперы (камячанне, скручванне, згінанне, складванне, гафрыраванне). Выкананне паштовак, пано, падвесных канструкцый у тэхніцы «папяровая пластыка» (тэматыка па меркаванні настаўніка).

Чаканыя вынікі

Вучні маюць уяўленні аб:

форме, велічыні, колеры;

мастацкіх матэрыялах, інструментах, прыладах і асноўных правілах работы з імі;

асноўных відах мастацтва (жывапіс, скульптура, графіка, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, архітэктура);

прыёмах і спосабах малявання, лепкі (камячанне, раскочванне, сціскание, прымазванне, адцягванне) і трансфармацыі паперы (камячанне, скручванне, згінанне, складанне).

Уменні (прадметныя):

перадаваць з дапамогай настаўніка вертыкальнае, гарызантальнае і нахільнае становішчы пры адлюстраванні прадметаў у прасторы; планавасць прасторы з дапамогай лініі гарызонту (лініі, якая дзяліць аркуш паперы на дзве часткі), размяшчаючы на лісце паперы асновы блізкіх прадметаў ніжэй за лінію гарызонту і большымі па памеры, далёкіх аб’ектаў – вышэй за лінію гарызонту і меншымі па памеры;

выкарыстоўваць розныя мастацкія матэрыялы і тэхнікі для вырашэння творчай задумы, валодаць элементарнымі прыёмамі работы;

маляваць з дапамогай настаўніка і адпаведнай нагляднасці (апорныя схемы, мадэлі) выявы раслін і жывёл, прыродных з’яў;

ствараць з дапамогай настаўніка дэкаратыўныя кампазіцыі ў паласе, квадраце, крузе з раслінных і геаметрычных элементаў; выкарыстоўваць для стварэння выяў па матывах беларускай народнай творчасці

характэрныя элементы і колер; пазнаваць рускую народную цацку – дымкаўскую (па навадных пытаннях настаўніка);

ляпіць з натуры, па ўзоры, уяўленні, тэме (тэматыка і выбар мастацкіх матэрыялаў па меркаванні настаўніка);

ствараць фактурную паверхню з дапамогай стэкі, прыродных і непрыдатных матэрыялаў;

аналізаваць і параўноўваць з дапамогай настаўніка выкананыя выявы, даваць ацэнку сваёй і рабоце аднагодкаў.

Вучні прымяняюць у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

прыёмы і спосабы, тэхнікі стварэння выяў у розных відах мастацка-творчай і тэатральна-гульнявой дзейнасці;

правілы паводзін у культурных установах (выставы, музеі), грамадскіх месцах, культавых збудаваннях;

тэхніку бяспекі падчас карыстання мастацкімі інструментамі і матэрыяламі, пры ўборцы і размяшчэнні іх у месцах захоўвання;

правілы паводзін і зносін падчас выканання калектыўных работ па ўспрыманні твораў выяўленчага мастацтва і практычнай мастацка-творчай і тэатральна-гульнявой дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

элементарныя эстэтычныя ўяўленні аб творах выяўленчага мастацтва, аб’ектах і з’явах навакольнай рэчаіснасці (з дапамогай настаўніка);

вопыт уласнай практычнай мастацка-творчай дзейнасці пры рэалізацыі творчых задум падчас тэатральна-гульнявой дзейнасці (падрыхтоўка касцюмаў, бутафорыі, атрыбутаў, куліс, дэкарацый (з дапамогай настаўніка)).

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

вызначаць эмацыйны стан намаляваных на карціне аб’ектаў (з дапамогай настаўніка);

пазнаваць, паказваць і называць значныя аб’екты культурнай спадчыны сваёй краіны і роднага горада, выкарыстоўваючы фонавую лексіку (з дапамогай настаўніка, з выкарыстаннем адпаведнай нагляднасці);

знаходзіць з дапамогай настаўніка неабходную для выканання работы інфармацыю ў матэрыялах падручніка, рабочым сшытку і да таго падобных крыніцах;

ацэньваць з дапамогай настаўніка вынікі ўласнай і мастацка-творчай дзейнасці аднакласнікаў (напрыклад, прыгожа, непрыгожа, акуратна, падобна да ўзору);

карыстацца атрыманымі практычнымі навыкамі ў паўсядзённым жыцці ў працэсе падрыхтоўкі калектыўных работ, стварэння падарункаў і сувеніраў, атрыбутаў да гульняў, дэкарацый да тэатральна-гульнявой дзейнасці, розных мерапрыемстваў мастацкай і спартыўнай накіраванасці;

вырашаць з дапамогай настаўніка практыка-арыентаваныя задачы,

якія забяспечваюць фарміраванне і развіццё сацыякультурных адносін навучэнцаў (выкарыстоўваць дадатковую літаратуру, уступаць ва ўзаемадзеянне з аднагодкамі і дарослымі для выканання практычных дзеянняў і дасягнення запланаваных вынікаў мастацка-творчай, тэатральна-гульнявой і іншых відаў дзейнасці).

## V КЛАС (35 гадзін)

### Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва (8 гадзін)

Эстэтычнае ўспрыманне аб’ектаў і з’яў прыроды (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Знаёмства з работамі вядомых мастакоў-жывапісцаў (на выбар настаўніка). Нацюрморт (малюнак гародніны, садавіны, кветак, прадметаў побыту). Пейзаж (малюнак прыроды).

Выразныя сродкі графікі (лінія, пляма, колер), скульптуры (аб’ём, форма, паварот, сілуэт), матэрыял (мармур, бронза, косць, дрэва), фактура (гладкая, шурпатая паверхня) (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Архітэктура. Архітэктурныя помнікі Беларусі (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна). Ахова прыроды, помнікаў культуры і гістарычных выдатных мясцін свайго рэгіёна.

Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Творы народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі і сумежных краін (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Прыкладны пералік твораў выяўленчага мастацтва

Жывапіс. В. Жоўтак. «Вясновы эцюд», «Восеньскае акно», «Кветнік», «Храм»; Н. Орда. «Нясвіжскі замак», «Гродна», «Валожынскі палац», «Лагойскі парк», «Мінск. Саборная плошча», «Свіслач», «Навагрудак»; І. Хруцкі. Серыя партрэтаў «Прыгожая незнаёмка», «Плады і дыня», «Нацюрморт з грыбамі», «Нацюрморт з яблыкамі, вінаградам і лімонам»; А.А. Кіпрэнскі. «Партрэт Я.У. Давыдава»; П.Д. Корын. «Партрэт маршала Г.К. Жукава»; П.П. Канчалоўскі. «Партрэт Героя Савецкага Саюза лётчыка А.Б. Юмашава»; А. Бархаткоў. «Бэз», «Снег у кастрычніку», «Зіма. Сонечны дзень»; В. Бялыніцкі-Біруля. «З наваколля Пяцігорска», «Вясна», «Лёд прайшоў», «Задуменныя дні восені», «Беларусь. Ізноў зацвіла вясна» і іншыя творы жывапісу (на выбар настаўніка).

Графіка. В. Васняцоў. «Берандзейкі», «Купава», «Мізгір», эскізы касцюмаў да оперы М.А. Рымскага-Корсакава «Снягурачка»; У. Фаворскі. «На базар»; М. Купрыянаў. «Зімовы пейзаж. Абоз»; В. Сяроў. «Накіды», «Аўтапартрэт у пятнаццацігадовым узросце», ілюстрацыі да байкі

І.А. Крылова; Н. Рушава. «Малюнак»; Б. Дзехцяроў, М. Усцінаў, Ю. Васняцоў, Л. Уладзімірскі, М. Радлаў, У. Савіч, У. Пашчасцьеў, А. Кашкурэвіч, Н. Сустава, М. Казлоў, Б. Забораў, В. Александровіч, В. Мікіта – ілюстрацыі да народных казак, аўтарскіх мастацкіх твораў (на выбар настаўніка).

Скульптура. А. Фінскі. Помнік Сімяону Полацкаму ў Полацку, помнік Адаму Міцкевічу ў Мінску, скульптурныя кампазіцыі для Нацыянальнага тэатра оперы і балета ў Мінску (у сааўтарстве са скульптарамі М. Шкробатам, Г. Буралкіным), знак «Нулявы кіламетр» на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску; В. Занковіч. Мемарыяльныя комплексы «Кацюша» ў Оршы, «Хатынь», «Брэсцкая крэпасць-герой», манументальна-дэкаратыўная кампазіцыя «Бег» на стадыёне «Дынама» ў Мінску, «Зіма» на пр. Пераможцаў у Мінску, «Партызанам Палесся» ў Пінску, «Беларусь партызанская» (2005) у Мінску; С. Бандарэнка. Рэльефнае пано «Песня пра зубра» для вестыбюля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, стэла «Трыумф» і Алея алімпійскай славы (культурна-спартыўны комплекс «Мінск-Арэна»), конны помнік князю Альгерду (Віцебск), скульптурная кампазіцыя «Беларусь гасцінная» для Палаца Незалежнасці; У. Жбанаў. «Каляска губернатара», «Паштальён», «Пакупнікі», «Конь», «Гусі», «Дама з сабачкам» у Мінску, фантан «Залаты трыліснік» ў Маладзечна, «Астролаг» у Магілёве і іншыя скульптурныя збудаванні (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Драўлянае разьбярства (разьба па дрэве: хатняе начынне, дэкор храмаў, іканастасы, батлейкі). Салома- і лозапляценне (кошыкі, цацкі і дэкор з саломы, шкатулкі і іншыя прадметы). Ткацтва і вышыўка (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна). Кераміка (хатняе начынне і інтэр’ерныя размаляваныя вырабы). Роспіс па шкле. Выцінанкі. Яйкі-пісанкі (з арнаментальным або сюжэтным малюнкам). «Івянецкія ўзоры», «Огаўскія куфры», «Слуцкія паясы», «Петрыкаўскі роспіс», «Жостаўскія падносы», «Хахламскі роспіс», «Гжэльскі фарфор» (на выбар настаўніка, вучняў).

Архітэктура. Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», Сімяонаўская царква, Касцёл Узвіжання Святога Крыжа, чыгуначныя вакзалы ў гарадах Брэсце, Мінску, Камянецкая вежа (Белая Вежа), Царква Святога Карла Барамеа ў Пінску, палац Бутрымовіча ў Пінску, палацавы комплекс у г. п. Ружаны, Косаўскі замак, палац Румянцавых і Паскевічаў у Гомелі, Касцёл Святога Міхала Архангела ў Мазыры, манастыр бернардынцаў, Мазырскі манастыр цыстэрцыянак, Петрыкаўская Мікалаеўская царква, Чачэрская ратуша, Барысаглебская (Каложская) царква, Каралеўскі палац у Гродна, Мірскі замак, Лідскі замак, царква-крэпасць у в. Мураванка (Шчучынскі раён), Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр, Петрапаўлаўскі сабор у Мінску, Архікафедральны касцёл

Прасвятой Дзевы Марыі, Царква Святога Благавернага Князя Аляксандра Неўскага, Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, Слуцкая брама, Свята-Мікольскі манастыр у Магілёве, Магілёўская ратуша, Шклоўская ратуша, Свята-Троіцкая царква ў Быхаве (помнік драўлянага дойлідства), Быхаўская сінагога, Казанская царква ў Віцебску, Касцёл Святога Яна Хрысціцеля ў аг. Камаі (Пастаўскі раён), Царква Успення Прасвятой Багародзіцы ў в. Сар’я (Верхнядзвінскі раён) і іншыя архітэктурныя помнікі (на выбар настаўніка, у залежнасці ад рэгіёна).

Практычная мастацка-творчая дзейнасць (27 гадзін)

Адлюстраванне на плоскасці (16 гадзін)

Адлюстраванне асобных прадметаў рознай формы, велічыні; раслін (агародніна, садавіна, лісце дрэў, дрэвы, кусты) на выбар настаўніка, вучняў.

Выкананне выяў па ўласных назіраннях і пасля ўспрымання мастацкіх твораў анімалістычнага жанру (карціны, малюнкі, скульптуры). Перадача вертыкальнага і нахільнага размяшчэння жывёл у малюнку (стаяць, ляжаць). Прыкладная тэматыка: «Сабака», «Певень і курачка», «Лісіца», «Паўлін» і да таго падобная тэматыка.

Маляванне фігуры чалавека (тулава, канечнасці, шыя, галава). Маляванне свайго партрэта і партрэтаў знаёмых людзей – бацькоў, брата, сястры, сяброў, дзядулі, бабулі (рэкамендуецца выкарыстанне шаблону асобы).

Маляванне відаў легкавога і грузавога транспарту з улікам яго прызначэння (малакавоз, мукавоз, хлебная машына, машына хуткай дапамогі, пажарная машына, гоначная, трамвай, тралейбус, аўтобус, трактар, пад’ёмны кран, камбайн), касмічнай тэхнікі (цацкі ў якасці натуры на выбар настаўніка, вучняў).

Адлюстраванне жылых, грамадскіх і іншых будынкаў. Прыкладная тэматыка: «Цырк», «Наша школа», «Церам-церамок», «Мост праз раку» і да таго падобная тэматыка.

Стварэнне простых сюжэтных кампазіцый: кампазіцыйная арганізацыя аркуша, вылучэнне кампазіцыйнага цэнтра ў адпаведнасці з сюжэтам (тэматыка па меркаванні настаўніка).

Маляванне на тэмы «Паводка», «Ранняя зіма», «Снегапад», «Летнія дзянькі», «Яблыні квітнеюць», «Сасновы бор» пасля разгляду ілюстрацый і рэпрадукцый карцін вядомых мастакоў (на выбар настаўніка).

Маляванне нацюрмортаў (розныя камбінацыі кветак, лісця, пладоў, прадметаў) і пейзажаў (розныя поры года, розныя віды мясцовасці) (мастацкія матэрыялы на выбар вучняў).

Замалёўкі па памяці пасля наведвання выстаў, музеяў, экспазіцый народных промыслаў (мастацкія матэрыялы на выбар вучняў).

Складанне ўзораў з геаметрычных і раслінных элементаў у паласе, квадраце, прамавугольніку, крузе, прымяняючы восевыя лініі; удасканаленне ўмення размяшчаць узор сіметрычна, запаўняючы сярэдзіну, вуглы, краі; знаходжанне гарманічна спалучаных колераў у рабоце з гуашавымі фарбамі (роўная зафарбоўка элементаў арнаменту з захаваннем контуру малюнка). Прыкладная тэматыка: разнастайныя кветкавыя пано (1–2 элементы ў паласе, крузе), аздабленне прадметных сілуэтаў адзення беларускім геаметрычным арнаментам, аздабленне квадратных і прамавугольных форм раслінным узорам з дапамогай беларускіх мастацкіх тэхнік «цацкаванне» і «фляндроўка» (беларускія макаткі, куфэркі) сурвэткі, дываны, паясы), раслінным узорам у традыцыйнай ці змешанай тэхніцы (напрыклад, маляванне пэндзлем + тэхніка пячатання, васковая крэйда + акварэль).

Знаёмства з прамысловай графікай (напрыклад, афармленне паштовага канверта мініяцюрным плакатам «Дзень Перамогі» – абеліск, Вечны агонь, феерверк, дата і да таго падобная графіка).

Знаёмства з гжэллю (двухкаляровая (бела-сіняя); рознакаляровая). Роспіс гжэллю сілуэтных форм (прадметы посуду, бытавога прызначэння, упрыгожванні).

Дэкаратыўна-афарміцельская дзейнасць па ўпрыгожванні памяшканняў, падрыхтоўцы выстаў, свят.

## Лепка (4 гадзіны)

Скульптурны рэльеф. Адлюстраванне галінкі дрэва (бяроза, дуб, клен і іншыя дрэвы).

Лепка фігуры чалавека, звяроў і птушак па ўяўленні (тэматыка і выбар мастацкіх матэрыялаў па меркаванні настаўніка, з дапамогай настаўніка, з выкарыстаннем нагляднасці).

Лепка казачнага героя (тэматыка па меркаванні настаўніка).

## Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн (7 гадзін)

Стварэнне пано з аплікацыяй з саломкі, засушаных кветак і лісця, кавалачкаў тканіны, каляровай паперы і іншых матэрыялаў («Лета», «Восень», «Зіма», «Вясна»).

Стварэнне казачных і фантазійных вобразаў (тэматыка і выбар мастацкіх матэрыялаў па меркаванні настаўніка).

Распрацоўка расліннага арнаменту для дыванкоў, шпалер, керамічнай пліткі і іншых вырабаў.

Выцінанка (ажурныя ўзоры з паперы). Знаёмства з прыёмамі выканання (тэматыка па меркаванні настаўніка).

Набойка. Падрыхтоўка штампа або трафарэта для пячатання ў два колеры на тканіне: «Шаль», «Хустка» (папера, нажніцы, клей, паралон).

Выраб навагодніх цацак, віншавальных паштовак і запрашальных білетаў на карнавал.

Чаканыя вынікі

Вучні маюць уяўленні аб:

асноўных відах (жывапіс, скульптура, графіка, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва) і жанрах (нацюрморт, пейзаж, анімалістыка) выяўленчага мастацтва;

прозвішчах і імёнах некаторых выдатных мастакоў, творах жывапісу, скульптуры, графікі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, архітэктуры;

найбуйнейшых музеях сталіцы, роднага горада;

форме, велічыні, колеры;

асноўных кампазіцыйных схемах і прасторавых паняццях (уверсе, унізе, справа, злева, каля, побач, пасярэдзіне, у цэнтры);

асаблівасцях будовы цела чалавека, жывёлы (тулава, шыя, галава, канечнасці);

мастацкіх матэрыялах, інструментах, прыладах, іх уласцівасцях, прызначэнні, правілах захоўвання, асноўных правілах работы з імі.

Уменні (прадметныя):

самастойна ці з мінімальнай дапамогай арганізоўваць сваё працоўнае месца ў залежнасці ад характару выкананай працы; правільна сядзець за сталом, размяшчаць аркуш паперы на стале, трымаць аловак, пэндзаль і іншыя інструменты;

знаходзіць з дапамогай настаўніка неабходную для выканання работы інфармацыю ў матэрыялах падручніка, рабочым сшытку, электронных адукацыйных рэсурсах, мастацкіх альбомах і іншых крыніцах;

прытрымлівацца парадку дзеянняў па прапанаваным плане, інструкцыях настаўніка або інструкцыях, прадстаўленых у іншых інфармацыйных крыніцах;

выяўляць з дапамогай настаўніка з натуры, па памяці, уяўленні, па інструкцыі аб’екты навакольнай рэчаіснасці;

арыентавацца ў прасторы аркуша;

размяшчаць выяву аднаго або групы прадметаў у адпаведнасці з параметрамі выяўленчай паверхні;

перадаваць планавасць прасторы (з дапамогай «лініі гарызонту» – лініі, якая дзеліць аркуш на дзве часткі, дзе ніжняя частка пазначае зямлю, верхняя – неба), размяшчаючы на аркушы паперы асновы блізкіх прадметаў ніжэй за лінію гарызонту і большымі, далёкіх аб’ектаў – вышэй за лінію гарызонту і меншымі па памеры;

адэкватна перадаваць колер адлюстраванага аб’екта, змешваць і атрымліваць адценні колераў;

пазнаваць, паказваць і называць у прыродзе, ілюстрацыях,

рэпрадукцыях прыродныя з’явы (іней, вецер), аб’екты (расліны, жывёлы) і перадаваць іх рознымі спосабамі (колеравы, лінейна-графічны, пластычны і дэкаратыўна-сілуэтны);

пазнаваць, паказваць і называць вырабы беларускіх (роспіс па дрэве, тканіны і шкле, вышыўка, ткацтва, разьба па дрэве, кераміка, салома-, лоза- і льнопляценне, каванне) і рускіх народных промыслаў (дымкаўскія цацкі, посуд і прадметы побыту, распісаныя гжэллю і іншыя вырабы) (па навадных пытаннях настаўніка);

паказваць і называць абагульняючую форму (круглая, авальная) як аснову выявы аб’ектаў расліннага і жывёльнага свету; вызначаць і выкарыстоўваць абагульняючую форму (прамавугольная, квадратная) як аснову выявы аб’ектаў: транспарту, мэблі, тэхнікі;

выконваць просты нацюрморт (2–3 прадметы), вылучаць нацюрморт (партрэт, пейзаж) з шэрагу іншых малюнкаў;

маляваць дэкаратыўныя кампазіцыі з раслінных і геаметрычных элементаў; выкарыстоўваць характэрныя элементы і колер для стварэння выяў па матывах беларускай народнай творчасці;

прымяняць прыёмы работы алоўкам, фарбамі (акварэль, гуаш), нетрадыцыйнымі матэрыяламі;

ляпіць з дапамогай настаўніка з натуры, па ўзоры, уяўленні, тэме аб’екты навакольнай рэчаіснасці, выкарыстоўваючы розныя прыёмы і спосабы малявання;

ствараць пано ў тэхніцы аплікацыі з саломкі, тканіны, паперы, прыроднага матэрыялу;

выразаць выцінанкі, ствараць падарункі і сувеніры, дэкаратыўныя кампазіцыі ў тэхніцы пячатання («набойка»), канструкцыі (мадэлі) у тэхніцы «папяровая пластыка»;

параўноўваць з дапамогай настаўніка выкананыя выявы;

адрозніваць і перадаваць у мастацка-творчай дзейнасці характар, эмацыйны стан і свае асобасныя адносіны да прыроды, чалавека, сям’і і грамадства.

Вучні прымяняюць у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

вопыт уласнай практычнай мастацка-творчай дзейнасці пры рэалізацыі творчых задум падчас тэатральна-гульнявой дзейнасці (падрыхтоўка касцюмаў, бутафорыі, атрыбутаў, куліс, дэкарацый (з дапамогай настаўніка));

назвы матэрыялаў і інструментаў, якімі карыстаюцца на ўроках;

правілы паводзін і зносін у культурных установах (выставы, музеі), грамадскіх месцах, культавых збудаваннях;

тэхніку бяспекі падчас карыстання мастацкімі інструментамі і матэрыяламі, пры іх уборцы і размяшчэнні ў месцах захоўвання, падчас выканання калектыўных работ, пры ўспрыманні твораў выяўленчага

мастацтва, практычнай мастацка-творчай, тэатральна-гульнявой і іншых відаў дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

выразныя сродкі выяўленчай дзейнасці (колер, форма, лінія, пляма, кампазіцыя, фактура, дынаміка і іншыя сродкі);

элементарныя эстэтычныя ўяўленні і асобасныя ацэначныя меркаванні аб творах выяўленчага мастацтва, аб’ектах і з’явах навакольнай рэчаіснасці;

практычныя выяўленчыя ўменні і навыкі, якія выкарыстоўваюцца ў розных відах выяўленчай дзейнасці, пры выкарыстанні розных мастацкіх матэрыялаў і мастацкіх тэхнік (напрыклад, пры стварэнні ансамбля маладзёжнага адзення для дзяўчыны або юнака (на выбар), распрацоўцы эскізаў сацыяльных плакатаў «Зберажом помнікі культуры і прыроды», праекта-макета «Куток школьніка», праектаў па стварэнні атрыбутаў для рэальных святочных падзей, народных свят, кірмашоў, школьных вернісажаў (напрыклад, «Кірмаш», «Дажынкі», «Свята ўраджаю», «Шырокая Масленіца»)); падчас канструявання з розных матэрыялаў (лега, мяккія модулі, драўляныя панэлі) пабудоў: дачных ансамбляў, жылых дамоў або катэджаў, кафэ (напрыклад, «Беларускія майстры», «Вясковыя хаты – тварэнне майстроў-дрываробаў», «Цяслярскія арцелі»).

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

выказваць свае эмацыйна-эстэтычныя адносіны да твораў выяўленчага мастацтва і навакольнага свету;

знаходзіць з дапамогай настаўніка неабходную для выканання работы інфармацыю ў матэрыялах рабочага сшытка, мастацкіх альбомах і да таго падобных крыніцах;

ацэньваць з дапамогай настаўніка вынікі ўласнай мастацка-творчай дзейнасці і аднакласнікаў (напрыклад, прыгожа, таму што…, акуратна, падобна на ўзор);

карыстацца атрыманымі практычнымі навыкамі ў паўсядзённым жыцці: дэманстраваць добразычлівасць і пазітыўнае эмацыйнае перажыванне, звязанае з атрыманнем новай інфармацыі, акуратнасць у працы, беражлівасць у дачыненні да выкарыстання выяўленчых матэрыялаў і іншыя навыкі;

ажыццяўляць аздабленне і ўпрыгожванне гатовых вырабаў;

ужываць словы, якія абазначаюць паняцці, названыя ў адпаведных раздзелах праграмы і абавязковыя для актыўнага выкарыстання ў мове.